Трэці этап рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах
«Беларуская мова» і «Беларуская літаратура» 2020/2021 навучальны год

# ТРЭЦІ ЭТАП XXXVII РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА» І «БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА»

## КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

*Студзень 2021 г.*

***БЛАНК ЗАДАННЯЎ***

**9 клас**
**Варыянт 1**

**Заданне 1.** Мастачка Ангеліна Коршунава намалявала серыю паштовак “Кола святаў”, дзе адлюстравала сваё ўяўленне пра святы і іх характарыстыку. Разгледзьце малюнкі і выканайце заданні.
а) У адпаведны слупок упішыце нумар паштоўкі згодна з яе характарыстыкай.
б) Зрабіце марфемны разбор вылучаных слоў.

*Максімальная колькасць балаў –* ***6.***

***Для даведкі:*** улічыце, што тут ёсць “лішняе” свята.

**Паштоўкі Ангеліны Коршунавай**

1




2




3




4




**Заданне 2.** Спалучыце часткі фразеалагічных адзінак са слупкоў 1 і 2, каб стварыць адну правільную фразему. Запішыце варыянты, якія атрымаліся, раскрываючы дужкі і ўстаўляючы патрэбныя літары.

*Максімальная колькасць балаў –* ***6.***

| 1 | 2 |
|---|---|
| без нічога | (не, ні) рук (не, ні) ног |
| не чуць | вянок не саў…еш |
| (на)тое і сабака | (ні)якага |
| з адной краскі | грушы на вярбе |
| вер…ці | (на)уцёкі |
| пусціцца | каб зайца ганяць |

**Заданне 3.** Падкрэсліце чацвёртае лішняе ў адпаведнасці з пазначанымі ў дужках характарыстыкамі. Патлумачце свой адказ.

*Максімальная колькасць балаў –* ***6.***

**Заданне 4.** Запішыце назоўнікі са значэннем асоб жаночага полу, якія ўтвораны з дапамогай наступных суфіксаў (**толькі па два словы з кожным суфіксам!**).

*Максімальная колькасць балаў –* ***6.***

**Заданне 5.** Прачытайце сказы з нарыса У. Караткевіча "Зямля пад белымі крыламі". Устанавіце адпаведнасць паміж выдзеленымі словамі і іх сінтаксічнай функцыяй. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў (напрыклад, А1Б2В2Г6Д4Е7). Улічыце, што сінтаксічныя функцыі могуць паўтарацца.

*Максімальная колькасць балаў –* ***6.***

| | |
|---|---|
| А: ***Возера*** Свіцязь, апетае Міцкевічам. | 1. Дзейнік. |
| Б: Стол і лаўкі часцей за ўсё былі ***з*** тоўстых дубовых ***дошак***. | 2. Частка дзейніка. |
| В: Беларусы ведаюць каля тысячы страў ***з бульбы***. | 3. Выказнік. |
| Г: Як сказаў [пра Мядзельшчыну] ***паэт*** П. Панчанка: "Аматар трымаць чорны камень за пазухай тут мог бы набраць іх на дзесяць вякоў". | 4. Частка выказніка. |
| Д: [На Мядзельшчыне] лубіну менш, затое сінія хвалі ільноў літаральна ***бясконцыя***. | 5. Прыдатак. |
| Е: На гарызонце зубчасты сілуэт ***лесу***. | 6. Дапасаванае азначэнне. |
| | 7. Недапасаванае азначэнне. |

**Заданне 6.** Маладыя журналісты прынеслі ў рэдакцыю газеты некалькі нататак на розную тэматыку. Праз некаторы час рэдактар вярнуў ім матэрыял з указаннем на неабходнасць сур'ёзнай стылістычнай праўкі. Дапамажыце журналістам знайсці і выправіць памылку і патлумачыць яе прычыны або паказаць рэдактару, што памылкі няма (у гэтым выпадку замест тлумачэння напішыце: "памылкі няма").

***Узор:***

| *Сказ* | *Выпраўлены варыянт* | *Тлумачэнне* |
|---|---|---|
| І вось амаль праз 40 гадоў гэта падзея зноў паўторыцца. | І вось амаль праз 40 гадоў гэта падзея паўторыцца. | *Паўтарыцца* – гэта значыць адбыцца зноў, яшчэ раз, таму ў спалучэнні *зноў паўторыцца* слова *зноў* лішняе. Памылка выклікана выкарыстаннем збыткоўнага слова (плеаназм). |

*Максімальная колькасць балаў –* ***6.***

| № | *Сказ* |
|---|---|
| 1. | Значэнне Беларускай АЭС для забеспячэння энергетычнай бяспекі і ў цэлым эканомікі нашай краіны проста велізарнае. |
| 2. | Са 160 пастаянных кліентаў фітнес-клуба купляць абанемент на красавік месяц пагадзілася толькі 10 працэнтаў. |
| 3. | Пакуль на вытворчым участку створана 73 рабочыя месцы, але наперадзе будучыя перспектывы. |
| 4. | Устаноўлена, што ў сем’ях, у якіх бацькі марнуюць шмат часу на размовы, гульні з дзецьмі, дзеці лепш развіваюцца. |
| 5. | Лёгкі, чысты лавандавы водар спрыяе аднаўленню сіл і дасягненню ўнутранай гармоніі. |
| 6. | Галоўны прыярытэт на свяце застанецца, вядома, за мясцовым кулінарным брэндам – хатнімі сырамі. |

**Заданне 7.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову.

*Максімальная колькасць балаў –* ***6.***

В конце XVI – XVIII столетий город Несвиж представлял собой динамичный административный, торговый, культурный и религиозный центр, влияние которого распространялось почти на всю территорию Великого Княжества Литовского. Благодаря активному взаимодействию на этническом и международном уровнях в Несвиже тогда создавалось то наследие, которое сегодня стало не только общебелорусской, но и общеевропейской ценностью.

*(Адам Мальдис. Белорусские сокровища за рубежом)*

**Заданне 8.** На літаратурнай кухні ёсць розныя інгрэдыенты. Дапамажыце кухару “прыгатаваць” санет, трыялет, оду, элегію. Кожная “страва” складаецца з 4 інгрэдыентаў, якія можна выкарыстаць толькі адзін раз.

*Максімальная колькасць балаў –* ***8.***

*Інгрэдыенты:*

- толькі 14 радкоў
- смутак
- адлюстроўвае важныя падзеі
- асноўны змест – сатыра
- меланхолія
- урачыстасць
- пахвала асобе
- толькі 8 радкоў
- толькі 16 радкоў
- журба
- мае толькі дзве рыфмы
- тройчы паўтараецца першы радок
- бывае французскім і італьянскім
- часцей чатыры страфы (два катрэны і два тэрцэты)
- можа складацца ў вянкі і вянкі вянкоў
- прысвячаецца падзеі або герою
- паказваецца несправядлівасць, сямейнае або грамадскае гора
- двойчы паўтараецца другі радок
- напісаны толькі анапестам
- эпічны твор

**Заданне 9.** Да назоўнікаў падбярыце адпаведныя прыметнікі так, каб атрымалася назва мастацкага твора, які вывучаўся на ўроках беларускай літаратуры. Звярніце ўвагу, што род, лік, склон прыметніка можна змяняць. Запішыце аўтара твора.

*Максімальная колькасць балаў – **6.***

**Прыметнікі:** ганарысты, жураўліны, жывы, маёвы, родны, сармацкі.
**Назоўнікі:** вада, кадзіла, крык, парсюк, песня, слова.

**Заданне 10.** Уявіце, што Вы з'яўляецеся рэдактарам зборніка вершаў вядомых усёй краіне беларускіх паэтаў, які мае назву "Ёсць на свеце мой алень…: вершы пра прыроду" і прызначанага для дзевяцікласнікаў. На жаль, апошнія чатыры старонкі рукапісу згубіліся. Падбярыце чатыры вершы для гэтай кнігі і напішыце анатацыю. Памятайце, што сваёй анатацыяй Вы павінны зацікавіць чытача.

*Максімальная колькасць балаў – **4.***

***Для даведкі.*** Анатацыя – гэта крэатыўная невялікая аб'ява для кнігі, дзе расказваецца, пра што гэта кніга, для каго прызначана, і даюцца пэўныя "гарантыі якасці".